На слыху

Галоўны санітарны ўрач Наталля ЖУКАВА:

# «Неабходнасці ў абмежавальных мерах няма»

**Трое хворых з падазрэннем на каранавірус знаходзяцца ў медустановах Беларусі. Намеснік міністра аховы здароўя, галоўны санітарны ўрач Наталля Жукава паведаміла, што імавернасць наяўнасці ў іх каранавіруснай інфекцыі мае высокую ступень. Пры гэтым суразмоўца паведаміла, што аналізы былі дадаткова накіраваны ў адну з лабараторый Сусветнай арганізацыі аховы здароўя для пераправеркі.**

Нагадаем, што першым пацыентам стаў студэнт БНТУ з Ірана, які 22 лютага прыляцеў з Баку ў Мінск. Аб яго станоўчым тэсце Міністэрства аховы здароўя паведаміла 27 лютага. Разам з ім у сталічную інфекцыйную бальніцу даставілі яго дзяўчыну і яе родных.

У суботу ў Міністэрстве аховы здароўя заявілі, што адзін з тэстаў у бацькі дзяўчыны даў сумнеўны вынік. Але клінічнай карціны захворвання ў мужчыны, гэтак жа як і ў самога іранскага студэнта, няма.

А 1 сакавіка **прэс-сакратар Міністэрства аховы здароўя Юлія БАРАДУН** паведаміла, што пад падазрэннем на заражэнне яшчэ адна беларуска. У РНПЦ эпідэміялогіі і мікрабіялогіі тэст віцьблянкі выявіў фрагменты РНК, якія могуць належаць тыпу каранавіруса 2019-nCoV. Тэсты праводзіліся ў межах актыўнага лабараторнага кантролю грамадзян, якія вярнуліся з эпідэміялагічна неспрыяльных раёнаў.

Вядома, што беларуска і двое яе калег прыбылі з Італіі. У сувязі з гэтым іх выклікалі ў медустанову, узялі тэсты і аналізы. Пацыенты былі шпіталізаваны ў Віцебскую абласную клінічную інфекцыйную бальніцу. Зараз іх стан здавальняючы, клінічнай карціны захворвання няма. Пра гэта расказаў **начальнік галоўнага ўпраўлення аховы здароўя Віцебскага аблвыканкама Юрый ДЗЯРКАЧ.**

Наталля Жукава адзначыла, што беларусы часта задаюць пытанні, як можна абследавацца. І нагадала, што мэтазгоднасць абследавання вызначае ўрач. Тэсты неабходна здаваць тым грамадзянам, якія наведвалі эпідэмічна неспрыяльныя краіны (КНР, Італія, Паўднёвая Карэя і Іран) і мелі блізкія кантакты з захварэлымі.

— Тыя, хто прыбывае з неспрыяльных рэгіёнаў, змяшчаюцца ў інфекцыйную бальніцу. І разам з тэстам на каранавірус у іх бяруць аналізы на іншыя рэспіраторныя інфекцыі. Калі аналіз на каранавірус не пацвярджаецца, пацыент накіроўваецца ў кантакт-цэнтр, дзе за ім вядзецца назіранне на працягу 14 дзён, — дадала **начальнік галоўнага ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі, экспертызы, звароту грамадзян і юрыдычных асоб Міністэрства аховы здароўя Алена БОГДАН.**

Наталля Жукава падкрэсліла, што неабходнасці ў абмежавальных мерах пакуль няма, акрамя выездаў арганізаваных груп у КНР, Італію, Паўднёвую Карэю і Іран. Нашэнне масак і выкарыстанне іншых сродкаў аховы яна парэкамендавала ў залежнасці ад стану здароўя. Нагадаем, што здаровым людзям спецыялісты не раяць насіць маскі.

Як адзначыў **прадстаўнік Сусветнай арганізацыі аховы здароўя ў Беларусі Батыр БЕРДЫКЛЫЧАЎ,** пакуль СААЗ не бачыць неабходнасці ў абмежаванні падарожжаў і гандлю. Такія меры ён назваў неэфектыўнымі. А вось меры, якія праводзіць Беларусь па выяўленні інфекцыі, даюць добрыя вынікі. Эксперт падкрэсліў, што ўчора на канферэнцыі Еўрапейскага бюро Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, у якой ад Беларусі ўдзельнічаў міністр аховы здароўя Уладзімір Караннік, былі адзначаны адкрытасць і аператыўнасць беларускай сістэмы аховы здароўя.

**Алена КРАВЕЦ.**

«Еўрабачанне-2020»

# ПОСПЕХ ПРЫVALІЎ

## Беларусь прадставіць небанальная песня на роднай мове

**У сямнаццаты раз наша краіна адправіць свайго музычнага прадстаўніка на міжнародны песенны конкурс «Еўрабачанне». За гэты час сярод канкурсантаў былі салісты і калектывы, дзяўчаты і хлопцы (дарэчы, паводле статыстыкі, менавіта салістаў-мужчын мы адпраўлялі часцей за ўсё — шэсць разоў). Але ўсяго толькі ў другі раз на конкурсе прагучыць беларуская мова — малады і свежы электронны праект VAL выканае ў Ратэрдаме сваю песню «Да відна», з якой музыкі днямі перамаглі ў нацыянальным адборы.**



Гэтым разам арганізатараў адбору як ніколі цягне ўхваліць. Па-першае, за сталую ўжо традыцыю анлайн-трансляцый жывога праслухоўвання, якое сведчыць «ху із ху». Па-другое, за перамену месца дзеяння, якая, магчыма, не паўплывала на вынікі, але дала магчымасць большай колькасці людзей жывым убачыць і пачуць, а такасама параўнаць фіналістаў адбору — у 1000-метровым павільёне кінастудыі «Беларусьфільм», дзе адбываўся канцэрт, яблыку доўга давялося б шукаць месца для падзення. Па-трэцяе, за разнастайны і пераканаўчы склад запрошанага журы, у якое ўвайшлі экс-удзельнікі «Еўрабачання» Дзмітрый Калдун (2007 год), Юрый Селязнёў (бэк-вакаліст у конкурсе 2014 і 2015 гадоў) і ЗЕНА (2019), кіраўнік ансамблю «Камерата» Вольга Вараб'ёва, заснавальнік самага ўплывовага ў свеце блогу пра «Еўрабачанне» Wiwibloggs брытанец Уільям Лі Адамс, грэка-кіпрыёцкі спявак і педагог па вакалу Алекс Панайі, прадзюсар леташняга конкурсу ў Ізраіліі, Талі Эшколі з тэлеканала KAN, адказны за найбуйнейшыя забаўляльныя тэлепраекты ў Нарвегіі Сціг Карлсен і прадзюсар і тэлежурналіст Джоана Левіева-Сойер, якая з 2012 года адказвае за «Еўрабачанне» ў Балгарыі. Такім чынам адразу было знятае пытанне аўтарытэту суддзяў: калі гэтыя людзі не разбіраюцца ў сучаснай музыцы, папулярных фарматах і конкурсных тэндэнцыях, то хто?

Важная акалічнасць: кожны з суддзяў асабіста агучыў і пракаментаваў выстаўленыя балы — прычым зрабілі гэта да абвяшчэння вынікаў глядацкага галасавання. І хоць кажуць, што вердыкт журы — сума суб'ектыўных меркаванняў, у беларускіх артыстаў і замежных экспертаў погляды збольшага супалі: найчасцей у тройцы фаварытаў аказваліся стыльны Ян Яраш, небанальныя VAL, высокапрафесійная Настасся Малашкевіч і дынамічная КейСі, любога з якіх было б не сорамна дэлегаваць на «Еўрабачанне».

У галасаванні публікі арганізатары таксама пастараліся ўлічыць усе хібы мінулых гадоў, каб мінімізаваць магчымасць штучнай «накруткі» — з аднаго нумара прымаліся толькі адзін званок і адно СМС за кожнага з фіналістаў. У выніку ў тройку лідараў у гледачоў увайшлі КейСі, VAL і эфектны гурт «Чакрас», які абазначыў унушальную групу падтрымкі актуальнымі маскамі, а песню без слоў упрыгожылі шаманскімі матывамі ад якуцкай выканальніцы Олены Уутай. Зрэшты, усяго гэтага аказалася не тое каб мала, а хутчэй занадта, і перамогу па суме балаў — 10 ад журы і 10 ад гледачоў, дарэчы, гэта цалкам характэрная гісторыя для «Еўрабачання» апошніх гадоў — сталі VAL. «У VAL быў спецыфічны, крэатыўны і, я сказала б, еўрапейскі нумар, — заўважыла **вядучая і спявачка, удзельніца «Дзіцячага Еўрабачання» Хелена МЕРААІ,** — таму абсалютна не дзіўна, што іх адзначылі міжнародныя эксперты».

— У якім стылі мы працуем? У сваім, ён так і называецца — ВЭЛ, Улад і Лера. Мы дагэтуль не верым, што гэта адбываецца з намі! — праз хвіліну пасля заканчэння прамога эфіру **ўдзельнікі праекту VAL спявачка Лера ГРЫБУСАВА і саўндпрадзюсар Улад ПАШКЕВІЧ** прымалі віншаванні сяброў і калег. — Вельмі рады, шчаслівыя і ўдзячныя за падтрымку абсалютна ўсім — і нашаму прадзюсару Андрэю Каліне, за якім мы адчуваем сябе як за каменнай сцяной, і ўсёй камандзе, і, вядома, нашым бацькам... Што адчуваем цяпер? Адначасова радасць і стомленасць. Мяркуем, дні на два з'ездзім некуды ў лес, у вёску ці санаторый, каб адпачыць, а потым з новымі сіламі за працу. Бо ёсць шмат нюансаў, якія трэба ўдасканальваць. Што канкрэтна будзем мяняць, пакуль не ведаем — усім спадабацца немагчыма, але заўвагі прафесіяналаў, безумоўна, улічым.

Музыканты расказалі, што працуюць разам з 2016 года, але спроба выйсці на «Еўрабачанне» для іх першая. Больш за тое, гэта наогул іх першая беларускамоўная песня, якую Мікіта Найдзёнаў напісаў адмыслова для ўдзельнікаў гурта. «Перакладаць на англійскую не будзем, — чуе ў агульным гомане пытанне «Звязды» Улад Пашкевіч, — гэта прынцыповы момант, каб ехаць з песняй на роднай мове».

Нагадаем, «Еўрабачанне-2020» адбудзецца ў Ратэрдаме (Нідэрланды) 12—16 мая гэтага года. Прадстаўнікі Беларусі выступяць у першым паўфінале, але гледачы ў нашай краіне па добрай завядзёнцы ўбачаць у прамым эфіры ўсе тры канцэрты — абодва паўфіналы і фінал.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**



Надвор'е

# Свежае паветра з Міжземнага мора

## У першай дэкадзе сакавіка прыйдзе красавіцкае цяпло?

**Вось і прыйшла вясна каляндарная, гэтым разам з актыўным сонцам і ўпэўненым цяплом. На бягучым тыдні на тэрыторыі краіны чакаецца цёплае і дажджлівае надвор'е, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Заўтра ўдзень захаваецца ўплыў вельмі цёплых паветраных мас міжземнаморскага паходжання. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 3 да плюс 8 градусаў. Удзень будзе 6—13 цяпла, а ў паўднёва-ўсходніх раёнах — ад плюс 14 да плюс 16 градусаў. Пры паўднёвым, паўднёва-ўсходнім ветры пераважна па паўночна-заходняй частцы краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай па паўднёвым усходзе месцамі магчымы туманы.

Але не трэба чакаць менавіта ў пачатку сакавіка пастаяннага цяпла. Сакавік — месяц зменлівы. А таму ў чацвер, 5 сакавіка, надвор'е ў краіне стане вызначаць халодны атмасферны фронт, які пачне адцiскаць цяпло на ўсход кантынента. Паўднёвы вецер зменіцца паўночным, стане значна свяжэй. У многіх раёнах пройдуць дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 2 да плюс 8 градусаў. Удзень будзе 4—9 цяпла, ва ўсходніх раёнах — плюс 10—15 градусаў.

Хто сказаў, што вясной не бывае снегу? Усё хлусня, бывае. Няўстойлівае надвор'е праявіць сябе ва ўсёй красе ў пятніцу. Будзе воблачна з праясненнямі. Уначы і раніцай на большай частцы тэрыторыі Беларусі, а ўдзень месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы, пераважна па захадзе краіны — з мокрым снегам. Уначы і раніцай месцамі чакаецца слабы туман, у заходніх раёнах — слабы галалёд. Тэмпература паветра ўначы знізіцца і складзе ад нуля па захадзе да плюс 7 градусаў па ўсходзе краіны. А ўдзень актыўнае сонца нагадае нам, што прыйшла вясна. Паўсюдна будзе 2—9 цяпла, а па паўднёвым усходзе краіны да плюс 13 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Культасвета

# Дом для коцікаў

**1 сакавіка стартаваў фотаконкурс, абвешчаны Вялікім тэатрам Беларусі. Напярэдадні прэм'еры оперы для дзяцей «Кошчын дом», першыя паказы якой адбудуцца 14 і 15 сакавіка, тэатр прапанаваў усім ахвотным «засяліць» дом сваімі ўлюбёнымі гадаванцамі.**

Каб стаць удзельнікам фотаконкурсу, трэба ў тэрмін да 9 сакавіка даслаць здымкі катоў — і не толькі — на адрас parter@bolshoibelarus.by ці размясціць іх у любых сацыяльных сетках з хэштэгам #Кошкиндом. Ужо 10 сакавіка самыя цікавыя здымкі трапяць на віртуальную выстаўку на сайце Вялікага тэатра, дзе за іх можна будзе прагаласаваць, — а траіх пераможцаў конкурсу абяцаюць запрасіць непасрэдна на спектакль.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**